

# З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ДАРАГІЯ СЯБРЫ!


*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 24 (1250) ● 31 жніўня 1979 г. Цана 2 кап.


**Савецкі спецыяліст сёння — гэта чалавек, які добра авалодаў асновамі марксісцка-ленінскага вучэння, ясна бачыць палітычныя мэты партыі і краіны, мае шырокую навуковую і практычную падрыхтоўку, дасканала валодае сваёй спецыяльнасцю.**

**Савецкі спецыяліст сёння — гэта ўмелы арганізатар, здольны на практыцы прымяніць прынцыпы навуковай арганізацыі працы. Ён можа працаваць з людзьмі, цэніць калектыўны вопыт, прыслухоўвацца да думкі таварышаў, крытычна ацэньваць дасягнутае.**

**І канешне, сучасны спецыяліст — гэта чалавек высокай культуры, шырокай эрудыцыі, увогуле гэта сапраўдны інтэлігент новага сацыялістычнага грамадства.**

**Л. І. БРЭЖНЕЎ.**

**(З прамовы на Усесаюзным злёце студэнтаў 19 кастрычніка 1971 г.)**

## Стань сапраўдным спецыялістам

Сёння пачатак вашага студэнцкага жыцця. У кожнага з вас зараз незвычайныя пачуцці. Збылася мара. Атрыман студэнцкі білет той ВНУ, якая яшчэ некалькі месяцаў назад была нечым прывабным, недасягальным. А сёння можна запраста ўзняцца па шырокіх лесвіцах галоўнага корпуса, зайсці ва універсітэцкую бібліятэку...

Першакурснікі павінны добра ўсведамляць, што вучоба ва універсітэце, які носіць імя вялікага Леніна і з'яўляецца адной з буйнейшых і старэйшых ВНУ рэспублікі, накладвае на іх асобую адказнасць. Паспяховая вучоба—асноўны адказ на клопаты партыі і ўрада аб маладым пакаленні нашай краіны. Кожны студэнт павінен атрымаць трывалыя веды па фундаментальных навуках і па спецыяльнасці. Неад'емнай часткай ведаў спецыяліста любога профілю з'яўляецца глыбокае авалоданне марксісцка-ленінскім вучэннем, вывучэнне дакументаў партыі, выпрацоўка класавага падыходу да з'яў і падзей грамадскага жыцця. З першых дзён першакурснікам неабходна актыўна ўключыцца ў грамадска-палітычную работу універсітэта, каб навучыцца кіраваць людзьмі, весці на прадпрыемстве, дзе яны будуць працаваць пасля заканчэння універсітэта, выхаваўчую работу. У гэтым дапаможа факультэт грамадскіх прафесій, школа маладога лектара, грамадска-палітычная практыка і г. д.

Ваш студэнцкі шлях пачынаецца якраз у той час, калі ўвесь савецкі народ самааддана працуе над выкананнем грандыёзных планаў дзесятай пяцігодкі — пяцігодкі эфектыўнасці і якасці. Ваша паспяховая вучоба, актыўная грамадска-палітычная работа — той важкі ўклад у выкананне планаў партыі, якога ад вас чакаюць.

Хутка мы адзначым слаўны юбілей — 110-ю гадавіну з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. Шматтысячны калектыў нашага універсітэта імкнецца сустрэць гэты юбілей найлепшымі паказчыкамі ў працы і вучобе. Мы павінны ўсё зрабіць для таго, каб гэты год пакінуў прыкметны след у гісторыі нашага універсітэта і прынёс новыя поспехі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў.

Новым клопатам аб развіцці вышэйшай школы, аб удасканаленні падрыхтоўкі маладых спецыялістаў з'явілася прынятая ў ліпені гэтага года пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР. У пастанове адзначаецца, што галоўная ўвага ВНУ павінна быць сканцэнтравана на ўсебаковым паляпшэнні якасці прафесіянальнай падрыхтоўкі і ідэйна-палітычнага выхавання спецыялістаў, умацаванні сувязі з вытворчасцю, практыкай камуністычнага будаўніцтва.

Калектыў універсітэта бачыць свой доўг у тым, каб з поўнай аддачай сіл працаваць над здзяйсненнем вялікіх задач, пастаўленых партыяй і ўрадам перад вышэйшай школай.

Вам, дарагія студэнты, прадстаіць складаная і вельмі напружаная праца на працягу многіх гадоў. І хочацца верыць, што кожны з вас знойдзе ў навуцы свой асабісты шлях, зможа з поўнай аддачай сіл працаваць на карысць нашай краіны.

За час вучобы ва універсітэце вы павінны набыць навыкі самастойнай працы, навучыцца правільна арыентавацца ў імклівым патоку навуковай інфармацыі. Гэта ўменне неабходна набыць з першых жа дзён вучобы.

На сучасным этапе навукова-тэхнічнай рэвалюцыі нельга стаць добрым спецыялістам без удзелу ў навукова-даследчай рабоце. Для гэтага ва універсітэце створаны ўсе ўмовы. Рашэннем Савецкага ўрада наш універсітэт увайшоў у лік вядучых ВНУ СССР, якія выконваюць навуковыя даследаванні, маючыя важнае народнагаспадарчае значэнне. Абавязак кожнага студэнта—з першых жа дзён вучобы актыўна ўключыцца ў НДР.

Але ва універсітэце вам прадстаіць не толькі вучыцца. У пазавучэбны час вас чакаюць гурткі мастацкай самадзейнасці, спартыўныя секцыі, зорныя паходы, цікавыя экскурсіі. У час летніх і зімовых канікулаў — студэнцкія будаўнічыя атрады.

Нядаўна з будоўляў трэцяга працоўнага вярнуліся вашы таварышы. У гэтым годзе іх было больш як 2700. Яны працавалі на БАМе і ў раёнах Нечарназем'я, у Карэліі і Малдавіі, у горадзе-героі Мінску і Мінскай вобласці. Іх рукамі ўпісаны важкі радок у працоўную біяграфію нашай краіны. Дзейнасць студэнтаў-будаўнікоў не абмяжоўваецца толькі будоўляй—усюды на месцах дыслакацыі яны выступалі з лекцыямі і дакладамі, канцэртамі мастацкай самадзейнасці, дапамагалі камплектаваць сельскія бібліятэкі. Усё гэта—шматгранная грамадска-палітычная работа.

Сёння трэці працоўны семестр працягваецца. У саставе студэнцкага атрада вы прымеце удзел у сельгасработах. Ваш абавязак — дапамагчы працаўнікам вёскі ў тэрмін убраць з палёў ураджай. Мы верым, што вы з гонарам выканаеце яго, унясеце пасільны ўклад у гэту агульнанародную справу, разам з таварышамі па групе, курсу арганізуеце і будзеце праводзіць лекцыйна-прапагандысцкую, культурна-масавую і шэфскую работу сярод мясцовага насельніцтва.

Хутка празвініць першы званок, і прасторныя аудыторыі запоўніць гаваркое, усхвалявалае студэнцтва. Першы выкладчык, першая лекцыя, першая адзнака—усё гэта наперадзе. Вы прыйшлі у наш калектыў, і мы ад душы рады вашаму прыходу ў краіну ведаў. Шчаслівай дарогі, вялікіх вам поспехаў!

**РЭКТАРАТ,**
**ПАРТКОМ,**
**МЯСЦКОМ,**
**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.**
**ПРАФКОМ.**

## Гэта цікава ведаць

Першыя студэнты—160 юнакоў і дзяўчат пачалі заняткі на рабочым факультэце універсітэта 1 чэрвеня 1921 г. 11 ліпеня на ўрачыстым сходзе прадстаўнікоў партыйных, савецкіх, камсамольскіх і іншых грамадскіх арганізацый рэспублікі было абвешчана аб стварэнні універсітэта, а 30 кастрычніка 1921 г. адбылося ўрачыстае яго адкрыццё.

* * *

1 лістапада 1921 г. 14 прафесараў, 49 выкладчыкаў, 10 асістэнтаў і 5 загадчыкаў кабінетаў пачалі рэгулярныя заняткі з 1390 студэнтамі двух факультэтаў — грамадскіх навук і медыцынскага.

* * *

На базе БДУ у 1930—1932 гг. былі створаны Мінскі медыцынскі інстытут, Мінскі педагагічны інстытут, Беларускі інстытут народнай гаспадаркі, Мінскі юрыдычны інстытут.

* * *

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны на шасці факультэтах універсітэта займалася больш як дзве тысячы студэнтаў, прафесарска-выкладчыцкі састаў налічваў 150 чалавек.




## Гэта цікава ведаць

У гады Вялікай Айчыннай вайны універсітэт быў поўнасцю разбураны і разграблены нямецка-фашысцкімі акупантамі. Урон, нанесены універсітэту, склаў 36,5 млн. руб.

* * *

ЦК КПБ, Савет Міністраў БССР, партыйныя і савецкія арганізацыі Мінска аказалі універсітэту ўсебаковую дапамогу. Ужо ў гады першай пасляваеннай пяцігодкі вучэбна-вытворчая база яго была адноўлена.

* * *

За гады існавання універсітэт падрыхтаваў больш як 50 тысяч спецыялістаў. Цяпер штогадовы выпуск складае каля трох тысяч чалавек па 61 спецыяльнасці. Падрыхтоўка спецыялістаў здзяйсняецца на 12 факультэтах.

* * *

У цяперашні час ва універсітэце займаецца каля 18 тысяч студэнтаў, у тым ліку на дзённым аддзяленні—больш як 10 тысяч. Вучацца ў аспірантуры па 73 спецыяльнасцях звыш 600 аспірантаў, замацаваны на кафедрах каля 600 спаборнікаў на атрыманне вучонай ступені.



# Вялікага вам плёну!

ДАРАГІЯ першакурснікі! Мне вельмі прыемна павіншаваць вас з новым навучальным годам і пажадаць выдатных поспехаў на вашым жыццёвым шляху. Доўга помніцца той дзень, калі збываюцца запаветныя мары. I вось сёння для вас гасцінна адкрыты дзверы Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Здзейснілася ваша жаданне вучыцца ў старэйшай навучальнай установе рэспублікі.

Школа дала вам грунтоўныя веды і навучыла працаваць. Але не раз вы адчулі сумненне і трывогу, ідучы ўпершыню на экзамены да незнаёмых вам людзей. Тысячы юнакоў і дзяўчат мараць аб універсітэце, аднак мы прымаем лепшых.

Шлях у вышэйшую школу вы адзначылі сумленнай вучобай і упартай працай. Мы падзяляем вашу радасць, спадзяёмся, што выбар ваш быў свядомы і прыйшлі вы да нас з добрымі намерамі.

Наш універсітэт мае добрыя традыцыі. Ён даў пуцёўку ў жыццё многім вядомым дзеячам навукі і культуры. Мы ўпэўнены, што і сярод вас ёсць будучыя вучоныя і пісьменнікі, дзяржаўныя дзеячы і героі працы, выдатныя даследчыкі і вынаходцы. Але навучанне — двухбаковы працэс. Выкладчык імкнецца даць веды, студэнт павінен імкнуцца іх атрымаць. Толькі пры такіх умовах вынікі будуць выдатныя. Мы ведаем, што гэты год быў для вас цяжкім, але шлях у навуку пачынаецца з першых жа дзён вашага студэнцкага жыцця.

Не лічыце, што на ўступных экзаменах скончыліся вашы цяжкасці і выпрабаванні. Перад вамі пяць год вучобы, ад іх залежаць ваш лёс, ваша будучыня. Першы год самы цяжкі: вы прыйшлі ў новыя ўмовы працы і жыцця. У школе за вамі сачылі настаўнікі і бацькі. Вы рыхтавалі на кожны урок невялічкія часткі матэрыялу са школьнага падручніка. А тут вы будзеце слухаць лекцыі, канспектаваць іх, самастойна працаваць над літаратурай, а ў канцы паўгоддзя здаваць экзамены па курсу, які праслухалі. Па кожнаму прадмету вы мелі адзіны падручнік, а тут вам спатрэбіцца многа кніг, прыйдзецца звяртацца да многіх крыніц. У школе ўсе кнігі былі вашымі, а тут без бібліятэкі не абысціся. Універсітэцкая бібліятэка — адна з багацейшых. У ёй вы знойдзеце ўсё, што вам будзе патрэбна. Чытальныя залы і кабінеты — лепшае месца для самастойнай працы. Ёсць на факультэтах і навуковыя гурткі, тут можна расшырыць свае веды і навучыцца прыёмам даследчай работы. Кожны можа выбраць сабе гурток у адпаведнасці з інтарэсамі.

Умовы студэнцкага жыцця патрабуюць і высокай свядомасці. Многія з вас будуць жыць у інтэрнатах, а то і на прыватных кватэрах, харчавацца ў сталовых, самастойна распараджацца стыпендыяй і бацькоўскай дапамогай. Усё гэта будзе рабіць на вас уплыў. Але заўсёды памятайце галоўную мэту — вучобу, упартую працу. Нават добрыя здольнасці гінуць, калі чалавек не працуе над сабой, спадзяецца на былыя заслугі. Усе тыя выпускнікі, што сталі выдатнымі спецыялістамі, былі не толькі здольнымі, але і працавітымі людзьмі. Глыбока сімвалічна і заслужана наш універсітэт адзначан ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Але студэнцкія гады—гэта таксама і грамадскае станаўленне. Нашы студэнты вядуць актыўную грамадскую работу, працуюць у будаўнічых атрадах, займаюць прызавыя месцы па многіх відах спорту, удзельнічаюць у конкурсах мастацкай самадзейнасці. Гэтым летам ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР прынялі пастанову аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Мы ўпэўнены, што перад Беларускім універсітэтам, як і перад іншымі ВНУ, адкрываюцца шырокія перспектывы.

Будзем спадзявацца, што новае студэнцкае папаўненне захавае лепшыя традыцыі старэйшых таварышаў, пашырыць славу Беларускага універсітэта, які з гонарам носіць вялікае імя У. І. Леніна.

Выдатных вам поспехаў, добрага настрою і нястомнай плённай працы на карысць нашай вялікай Радзімы!

**В. ЖУЧКЕВІЧ,**
**загадчык кафедры фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў, доктар геаграфічных навук, прафесар, заслужаны работнік вышэйшай школы.**

# ...добры, «альма матэр»!

*ЭПАРТАЖ*





**Табе сёння ўручылі студэнцкі білет і залікоўку. Яшчэ незнаёмыя універсітэцкія калідоры і лабараторыі гатовы прыняць цябе, як старога знаёмага. І мабыць таму крыху сцерліся ўжо з тваёй памяці моманты ўступных экзаменаў — твайго апошняга абітурыенцкага выпрабавання. Аб іх напомніў у сваім рэпартажы фотакарэспандэнт нашай газеты М. ДУБОВІК. Вось такім ты быў на ўступных экзаменах, сённяшні першакурснік.**



# Смялей наперад




Ты замяніў мяне ва універсітэце, першакурснік. Цяпер ты будзеш займацца ў маіх аўдыторыях, слухаць лекцыі маіх прафесараў, браць у бібліятэцы тыя ж кнігі, па якіх вучыўся я. Ты стаіш на парозе яшчэ незнаёмага, цудоўнага, непаўторнага студэнцкага жыцця. Можа ў чым-небудзь спатрэбіцца табе парада выпускніка? Дазволь перад пачаткам вучобы падзяліцца набытым за пяць год вопытам.

**Ларыса Казлоўская, выпускніца механіка-матэматычнага факультэта:**

— Хочацца пажадаць малодшаму сябру-першакурсніку ўпэўненасці. Калі спачатку не ўсё зразумела — не трэба баяцца і панікаваць. Толькі самастойная, сур'ёзная праца прывядзе да станоўчых вынікаў.

**Іна Карнялюк, выпускніца гістарычнага факультэта:**

— Вельмі важна з першых дзён уключыцца ў вучобу і грамадскае жыццё. Будзьце актыўнымі. Працуйце ў навуковых гуртках. Не губляйце магчымасцей удзельнічаць у культурна-масавых мерапрыемствах. Толькі тады студэнцкае жыццё будзе карысным.

**Ігар Лебедзеў, выпускнік факультэта прыкладной матэматыкі:**

— «Усе мы былі маленькімі вучонымі на першым курсе», — сказаў неяк мой сябар, які закончыў універсітэт. Бадай, ён правільна выразіў жыццёвае крэда значнай часткі першакурснікаў. Не бяда, што гэтыя нашы мары к пятаму курсу яшчэ не становяцца рэальнасцю. Толькі невялікі працэнт студэнтаў, найбольш адораных і таленавітых, зможа адразу пайсці па навуковай дарозе. Нічога, вы маладыя і славалюбівыя, і ў вас усё наперадзе. Смялей наперад.

Абавязкова ўдзельнічайце ў студэнцкім будаўнічым руху. Жыццё і праца, часам цяжкая праца ў СБА прыносяць сапраўднае задавальненне, запамінаюцца асабліва ярка. Не пазбаўляйце сябе гэтага.

**Ларыса Рахманава, выпускніца фізічнага факультэта:**

— Часцей наведвайце бібліятэку. Гэта датычыцца ўсіх. Студэнтам жа нашага факультэта параіла б у першую чаргу як мага раней заняцца навуковай работай. Выбірайце кафедру па зацікавіўшай спецыялізацыі — і працуйце.

# Каб жыццё было цікавым

На ўліку ў студэнцкай прафсаюзнай арганізацыі звыш 10 тысяч членаў прафсаюза. Дзейнасць яе арганізуецца і накіроўваецца прафсаюзным камітэтам, які асноўную ўвагу ўдзяляе пытанням падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, валодаючых марксісцка-ленінскай тэорыяй, навыкамі арганізацыйнай, масава-палітычнай работы.

У пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб вышэйшай школе звяртаецца ўвага на неабходнасць далейшага павышэння ролі прафсаюзных арганізацый ва ўдасканаленні вучэбна-выхаваўчай работы, форм і метадаў сацыялістычнага спаборніцтва. Здзяйсненне гэтай задачы прафсаюзны камітэт бачыць у далейшым паляпшэнні метадаў і стылю прафсаюзнай работы, кіраўніцтва прафсаюзным бюро факультэтаў і студэнцкімі саветамі інтэрнатаў, у павышэнні ролі прафсаюзнай групы.

Пытанням быту і адпачынку студэнтаў удзяляецца вялікая ўвага. Яны пастаянна ў цэнтры дзейнасці прафкома. Студэнцкія інтэрнаты з'яўляюцца цэнтрам выхаваўчай работы, якую пад кіраўніцтвам прафкома ажыццяўляюць студсаветы. Лекцыі і канцэрты, сустрэчы з цікавымі людзьмі, вечары пытанняў і адказаў, вечары адпачынку, інтэрнацыянальнай дружбы — гэтыя і многія іншыя мерапрыемствы збіраюць у вольны час шырокую аўдыторыю. Пры інтэрнатах арганізуюцца і працуюць розныя гурткі.

Прафсаюзная арганізацыя універсітэта праводзіць лячэбна-аздараўленчыя мерапрыемствы. Студэнты на льготных умовах атрымліваюць пуцёўкі ў прафілакторый, санаторый, дамы адпачынку. Толькі ў міжвузаўскім прафілакторыі на Мінскім моры за год адпачываюць звыш 700 студэнтаў.

У перыяд летніх канікулаў у маляўнічым месцы на возеры Нарач працуе студэнцкі спартыўна-аздараўленчы лагер, у якім з 1 ліпеня па 27 жніўня за тры змены адпачывае 750 студэнтаў. Прафком арганізуе таксама абмен пуцёўкамі ў спартыўна-аздараўленчыя лагеры Ерэванскага, Калінінградскага, Кішынёўскага універсітэтаў.

Шмат калектываў мастацкай самадзейнасці працуе на факультэтах. Усяго іх налічваецца каля 130. Кожны трэці студэнт універсітэта —удзельнік мастацкай самадзейнасці.

Прафсаюзны камітэт праяўляе штодзённы клопат аб развіцці мастацкай самадзейнасці, паляпшэнні якасці рэпертуару калектываў. Пад яго непасрэдным кіраўніцтвам працуе студэнцкі клуб.

Дарагі першакурснік! Прафсаюзны камітэт запрашае цябе прыняць удзел ва ўсіх нашых справах. Мы чакаем цябе ў калектывах мастацкай самадзейнасці, чакаем у прафкоме універсітэта, прафсаюзных бюро факультэтаў, студсаветах інтэрнатаў з каштоўнымі прапановамі наконт арганізацыі ўмоў працы, быту і адпачынку.

**Р. СМАЛЕНСКАЯ,**
**намеснік старшыні прафкома.**

# СКАРБОНКА ЧАЛАВЕЧАГА РОЗУМУ

што чалавек за ўсё жыццё можа прачытаць прыблізна ад 3—4 да 10—12 тысяч кніг. А гэта, як гаворыцца, капля ў моры. Для чытання трэба выбіраць толькі лепшыя і неабходныя творы.

Як жа знайсці ў гэтым вялікім кніжным акіяне патрэбныя кнігі? Як сучасны горад мы не ўяўляем без даведачных бюро, так нельга ўявіць і бібліятэку без галоўнай адраснай кнігі — даведачнага апарату: энцыклапедый, слоўнікаў, інфармацыйна-даведачных выданняў, бібліяграфічных указальнікаў, бібліятэчных каталогаў. З усім гэтым вы зможаце пазнаёміцца ў чытальнай зале № 2 (галоўны корпус, 2-гі паверх). На навуковым абанеменце (галоўны корпус, 2-гі паверх) вы зможаце атрымаць навуковую і мастацкую літаратуру, дапаможнікі вы атрымаеце на вучэбным абанеменце (галоўны корпус, 3-ці паверх). У ваша распараджэнне будуць прадастаўлены студэнцкія чытальныя залы: зала № 1 грамадскіх і гуманітарных навук, зала № 4 прыродазнаўчых і тэхнічных навук, зала сацыяльна-эканамічных і гістарычных навук.

Неяк у зборніку «Слова аб кнізе», складзеным Е. С. Ліхтэнштэйнам, мне давялося прачытаць тэкст наіўнага, але да гэтага часу не страціўшага сваёй надзённасці плаката:

«Пераканаўчая просьба кнігі: калі ласка, не бярыце мяне бруднымі рукамі: мне будзе сорамна, калі мяне возьмуць іншыя чытачы. Не скрэслівайце мяне пяром і алоўкам — так непрыгожа. Не стаўце на мяне локці, калі чытаеце, і не кладзіце мяне раскрытай тварам уніз, вам жа таксама не спадабалася б, калі б з вамі так абыходзіліся. Не кладзіце таксама ў мяне алоўкаў, нічога тоўстага, акрамя танюсенькага лістка паперы, інакш парвецца карашок.

Калі вы не закончылі чытаць і хвалюецеся, як бы не згубіць месца, дзе вы спыніліся, то не рабіце адзнакі пазногцем, а пакладзіце ў мяне закладку, каб я магла спакойна і зручна адпачыць...»

Не трэба прадаўжаць гэты азбучны пералік прапаноў. Думаецца, галоўнае ў тым, каб кожны з чытачоў, прыходзячы ў бібліятэку, памятаў, што ён карыстаецца бясцэнным грамадскім здабыткам, створаным не толькі для яго, але і для тысяч іншых людзей — нашых сучаснікаў і нашчадкаў.

Мы спадзяёмся, што кожная прачытаная вамі кніга стане новым крокам да наступнай, будзе расшыраць, паглыбляць і ўзбагачаць накопленыя веды.

**І. АРЭХОЎСКАЯ,**
**дырэктар бібліятэкі БДУ.**

ТРЭЦІ ПРАЦОЎНЫ — НА ВЫДАТНА

**Майстрам на ўсе рукі нярэдка называюць байца СБА. І гэта сапраўды так. Ён і будаўнік, і меліяратар, і праваднік, і працаўнік цагельнага завода. Ён дапамагае ўбіраць ураджай мясцоваму калгасу і шэфствуе над піянерамі. Ён удзельнік аперацыі «Памяць», ён — лектар і прапагандыст, ён спартсмен, ён артыст, нарэшце. Але кім бы ён ні быў, галоўнае — на працягу кожнага трэцяга семестра, працуючы побач з кадравымі рабочымі, ён уносіць свой працоўны ўклад у выкананне велічных планаў пяцігодкі, у эканоміку нашай краіны.**

# На ўдарнай—па-ўдарнаму

Гавораць, што адно і тое ж двойчы не паўтараецца. Але для байцоў студэнцкага будаўнічага атрада імя Нікольскага Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна гэтыя словы атрымалі новы сэнс. Другі год запар атрад працуе на Усесаюзнай камсамольскай будоўлі.

У 1978 годзе байцы атрада ўпершыню сталі непасрэднымі ўдзельнікамі адной з важных будоўляў краіны — 4-га Салігорскага калійнага камбіната ў Беларусі. І хаця шмат што для байцоў было новым і нязвыклым, працавалі яны добра, душою хварэлі за справу.

Гэты энтузіязм і ўменне працаваць адбіліся на выніках — дагаворныя абавязацельствы былі выкананы на 170 працэнтаў, пры гэтым атрад актыўна ўдзельнічаў у культурным жыцці горада Салігорска. Па выніках работы за 1978 год студэнцкі будаўнічы атрад імя акадэміка Нікольскага заваяваў адно з першых месц па Белдзяржуніверсітэту, і яму было прадастаўлена ганаровае права прыняць удзел у будаўніцтве Байкала-Амурскай магістралі.

Атрад працуе на добраўпарадкаванні станцыі Залацінка — беларускай «сталіцы» БАМа — разам з ветэранамі-кедышкінцамі, якія пачыналі будаваць Залацінку ў 1975 годзе. Лозунг байцоў атрада імя М. Кедышкі «Даеш станцыю Залацінка да дня нараджэння Ленінскага камсамола!» байцы СБА падтрымалі заклікам «Працаваць так, як працуюць нашы землякі!».

Зараз ужо добра бачна, якой будзе станцыя праз два — тры месяцы, як прымае яна той воблік, які быў задуманы архітэктарамі.

Можна быць упэўненымі ў тым, што намечаныя работы будуць выкананы раней тэрміну і з добрай якасцю. Зарукай гэтага з'яўляецца самаадданая праца ўсяго атрада. Асабліва хацелася б адзначыць работу Г. Храпко, В. Аляксеенкі, Я. Адамовіча, А. Грыгаровіч, А. Перапёлкіна, А. Сатоліна і іншых.

Атрад праводзіць вялікую грамадска-палітычную работу ў пасёлках Залацінка і Іенгра. Агітбрыгада атрада выступіла з канцэртамі перад будаўнікамі БАМа і мясцовымі жыхарамі.

Мы імкнёмся зрабіць усё магчымае для таго, каб памяць ба студэнтах з Беларусі засталася ў Залацінцы на многія гады.

**В. ГОЛУБЕЎ,**
**камісар СБА імя Нікольскага,**
**П. АКСЮЦІЧ,**
**камандзір СБА імя Нікольскага.**



# Карэльскія замалёўкі

Па дарозе ўвесь час успаміналіся радкі: «Остроконечных елей ресницы над голубыми глазами озер». Вочы былі шэрыя... Магчыма таму, што адбілася ў іх неба ў цяжкіх свінцовых хмарах. Затое Лоухі сустрэлі сонейкам, якое ўстае надзвычай рана і садзіцца надзвычай позна.

У Лоухах не згубішся: гарадок невялікі, ды і чырвоныя стрэлкі-ўказальнікі вельмі дакладна сарыентуюць: «СБА імя У. Амельянюка».

Як тэатр пачынаецца з гардэроба, так атрад пачынаецца з гэтага ўказальніка—адразу адчуваецца прысутнасць студэнтаў. Дарожкі да інтэрнатаў пракладзены цагляныя, на флагштоку—беларускі сцяг.

Атрад імя У. Амельянюка — журналісты. Аб гэтым здагадваешся, яшчэ не ўбачыўшы іх. Перафразіруючы вядомую прымаўку, можна сказаць: пакажы мне сваё жыллё, і я скажу, хто ты. Аб байцах атрада іх жыллё дае максімум станоўчай інфармацыі. Усё атраднае жыццё адлюстравана ў мностве нумароў насценгазеты «Арбіта», аб выдатных поспехах коратка і ясна паведамляюць «маланкі».

У ленінскім пакоі маляўнічыя стэнды раскажуць госцю аб Беларусі, аб універсітэце, аб факультэце журналістыкі ў прыватнасці.

У адным з пунктаў сацыялістычных абавязацельстваў атрадаў Лоухскай зоны гаворыцца: перадаць школьнай бібліятэцы па месцу дыслакацыі не менш як 1000 тамоў мастацкай і навукова-папулярнай літаратуры. Палову гэтай колькасці прывёз атрад журналістаў. Рабяты змаглі так арганізаваць свой быт, сваё жыццё па-за аб'ектам, што да іх, як гаворыць камісар, няма пытанняў. У атрадзе адчуваецца калектыў, у якога мноства разнастайных інтарэсаў. Радыёвузел (студэнты прывезлі і змантыравалі яго самі) транслірує палітінфармацыі, тэматычныя гутаркі або музычныя перадачы. А пра дыскатэку СБА можна пачуць ад любога жыхара Лоухаў. «Дыскатэчныя» чацвяргі сталі тут традыцыйнымі.

* * *

Перш чым на прычале праплыў і спыніўся надпіс «в. Кіжы», я ўбачыла ў ілюмінатар цеплахода вялізныя чырвоныя літары: «Спадчына». Жыве атрад мехмата БДУ побач з прычалам і са сваім аб'ектам—новым прычалам, які будуецца да Алімпіяды-80. Дарэчы, рыхтуюць яго рабяты да прысваення «Студэнцкага Знака якасці»...

«Спадчына»—гэта атрад, пастаўлены ў незвычайныя ўмовы вострава. Ды яшчэ і дзве брыгады працуюць у другім месцы, будуюць механізаваны прычал у Пудожы. Аб'екты значныя. І працаёмкія. Шмат бетонных работ. Так што рабяты нездарма зрабілі жартоўны транспарант: «Пабудуем прычал без адзінага цвіка!». Што ж, упішацца ён па стылю ў старажытныя Кіжы.

Нягледзячы на ўсё гэта, і план па асваенню перавыкананы, і грамадска-палітычная работа вядзецца. У адной з суседніх вёсак уладкаваўся атрад студэнтаў з Рыгі. Хутка наладзілі з ім кантакты—правялі ўжо некалькі сумесных вечароў, сустрэчы па футболу. Жыццё не замыкаецца на атрадзе.

«А працуюць рабяты—«Я ніколі так не працаваў», паўжартоўна, паўсур'ёзна прызнаецца адзін з рабочых плаўбудатрада № 26, дзе працуюць і студэнты. Сярод іх ёсць свае бетоншчыкі, муляры, цесляры, стропальшчыкі, вібратаршчыкі. Адным словам—поўны камплект будаўнічых спецыяльнасцей.

**М. СУЛЬДЗІНА.**

# Шчаслівых стартаў!

**Ф**ІЗІЧНАЕ выхаванне — неад'емная частка сістэмы камуністычнага выхавання, якое забяспечвае гарманічнае развіццё асобы. Яно з'яўляецца важным сродкам, які садзейнічае ўсебаковаму фізічнаму і духоўнаму развіццю студэнтаў.

З часу заснавання універсітэта фізічная культура і спорт карыстаюцца ў ім вялікай папулярнасцю. Любоў да фізічных практыкаванняў, прывітая студэнтам за гады вучобы, застаецца на ўсё жыццё, дапамагае паспяховай вучобе. Многія выпускнікі універсітэта, цяпер вядомыя вучоныя, дабіліся значных поспехаў у спорце. Так, акадэмік, дырэктар інстытута матэматыкі Акадэміі навук БССР У. П. Платонаў, будучы студэнтам, паспяхова выступаў у спаборніцтвах па баскетболу. Рэктар Беларускага політэхнічнага інстытута, прафесар В. Д. Ткачоў займаўся спартыўнай гімнастыкай, дэкан механіка-матэматычнага факультэта універсітэта, прафесар А. С. Фядэнка паказваў высокія вынікі ў горным турызме. Двойчы мастрам спорту — па класічнай барацьбе і турызму з'яўляецца кандыдат фізіка-матэматычных навук А. Б. Антаневіч. Дружба, прычым цесная, з фізічнымі практыкаваннямі павінна стаць неад'емнай часткай рэжыму кожнага студэнта ўжо з першага курса.

Значны ўклад у спартыўныя поспехі краіны і рэспублікі ўнеслі выхаванцы спортклуба БДУ. Былы студэнт хімфака В. Гараеў, зараз кандыдат навук, заваяваў сярэбраны медаль у трайным скачку на Алімпійскіх гульнях у Рыме ў



1960 годзе. Гонар Савецкага Саюза на Алімпійскіх гульнях у Манрэале абараняла студэнтка юрфака Т. Бойка-Шляхто. У розныя гады высокія спартыўныя вынікі паказвалі і паказваюць А. Гантварг, В. Купрэйчык, І. Тарасюк, І. Саўпель, А. Лазараў. На VII летняй спартакіядзе народаў СССР выкладчык кафедры фізвыхавання В. С. Фралоў стаў уладальнікам сярэбранага медаля ў гонцы на яхце класа «Зоркавы».

Неаднаразовымі чэмпіёнамі і прызёрамі першынства Беларусі сярод ВНУ з'яўляюцца каманды нашага універсітэта па баскетболу, валейболу, футболу, цяжкай і лёгкай атлетыцы, іншых відах спорту.

Фізічнае выхаванне ў нашым універсітэце ў цяперашні час будуецца па двух асноўных напрамках: абавязковыя заняткі і спартыўна-масавая работа. На першых двух курсах студэнты займаюцца фізкультурай чатыры гадзіны ў тыдзень, на трэцім курсе — дзве.

Акрамя таго, студэнты па свайму жаданню могуць займацца наступнымі відамі спорту: акрабатыкай, альпінізмам, баскетболам, боксам, чатырма відамі барацьбы (класічнай, вольнай, самба, дзю-до), валейболам, веласпортам, гімнастыкай спартыўнай і мастацкай, гандболам, канькамі, лыжным спортам, лёгкай атлетыкай, плаваннем, настольным тэнісам, цяжкай атлетыкай, турызмам, фехтаваннем, футболам, шахматамі. Так што першакурснікам ёсць дзе паспрабаваць свае сілы. Студэнт, якога прынялі ў групу спартыўнага ўдасканалення (спартыўную секцыю), у далейшым вызваляецца ад абавязковых заняткаў па фізічнаму выхаванню.

Трэба падкрэсліць, што на пачатку ўсёй працы па фізічнай культуры і спорту ва універсітэце ляжыць падрыхтоўка і здача нарматываў Усесаюзнага комплексу ГПА. Згодна з патрабаваннямі праграмы па фізічнаму выхаванню для ВНУ ў канцы II курса студэнты павінны выканаць нарматывы на значок ГПА поўнасцю. Толькі ў гэтым выпадку яны маюць права на залік. Выключэнне складаюць толькі фізічна аслабленыя студэнты з сур'ёзнымі адхіленнямі ў стане здароўя. Для іх штогод арганізуюцца спецыяльныя медыцынскія групы, заняткі ў якіх праводзяць кваліфікаваныя спецыялісты. На кафедры фізвыхавання і спорту працуе 55 выкладчыкаў, якія маюць вялікі вопыт практычнай работы.

Даволі значная і спартыўная база універсітэта. У яе ўваходзіць стадыён з 400-метровай бегавой дарожкай, 6 спартыўных залаў, лыжная база і велабазы.

Штогод у нашым універсітэце праходзіць круглагадавая спартакіяда па 23 відах спорту. Усе факультэты выстаўляюць каманды на гэтыя спаборніцтвы. Асабліва масавымі з'яўляюцца восеньскі і веснавы кросы.

Кожны з вас, першакурснікаў, зможа прыняць удзел у гэтых спаборніцтвах. Чакаем вас на стадыёне, у спартыўных залах. Шчаслівых вам стартаў!

**В. ФЕФЕЛАЎ, загадчык кафедры фізвыхавання і спорту**

**Рэдактар А. ДЗЕРАШ.**

НАШ АДРАС **220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.**